ВЕСЦІ АКАДЭМІІ АГРАРНЫХ НАВУК БЕЛАРУСІ
№ 3 1992

## *ГАДАВЫ АГУЛЬНЫ СХОД АКАДЭМІІ АГРАРНЫХ НАВУК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ*

## АКАДЭМІЯ АГРАРНЫХ НАВУК РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА ШЛЯХУ СТАНАЎЛЕННЯ

У гэтым нумары часопіса «Весці Акадэміі аграрных навук Беларусі» друкуецца падборка матэрыялаў Агульнага сходу Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь, які адбыўся ў маі 1992 г. На ім былі разгледжаны задачы акадэміі па развіцці аграрнай навукі ў рэспубліцы, а таксама праведзены выбары правадзейных членаў (акадэмікаў) і членаў-карэспандэнтаў акадэміі.

З дакладам па першым пытанні на Агульным сходзе выступіў Прэзідэнт акадэміі акадэмік В. С. Антанюк. У абмеркаванні яго даклада прынялі ўдзел У. П. Самсонаў, І. М. Багдзевіч, М. Ф. Пракапенка, В. Ф. Самерсаў, С. І. Назараў, М. А. Кавалёў, Л. У. Хатылёва, С. І. Грыб, С. Г. Шарэцкі, В. А. Сідаровіч, М. Е. Заяц, М. І. Смяян, М. Ц. Гарачка, І. М. Карпуць, Я. В. Ракавец, Н. В. Іванова, намеснік Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь А. І. Бокач.

У прынятай пастанове прызнана мэтазгодным сканцэнтраваць намаганні акадэміі на развіцці прыярытэтных навуковых даследаванняў, якія забяспечылі б навукова-тэхнічны прагрэс у розных галінах аграпрамысловага комплексу, распрацоўцы навуковых асноў прыродакарыстання, эканамічных і сацыяльных мерапрыемстваў па стымуляванні навукова-тэхнічнага прагрэсу і забеспячэнні інтэнсіўных форм развіцця аграпрамысловай вытворчасці.

Затым адбыліся выбары правадзейных членаў (акадэмікаў) і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь на аб'яўленыя вакансіі. Матэрыялы экспертнай камісіі па выніках выбараў акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў акадэміі публікуюцца ў дадзеным нумары часопіса.

У склад Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь у цяперашні час уваходзяць дзевяць правадзейных членаў (акадэмікаў) і шаснаццаць членаў-карэспандэнтаў. Правадзейныя члены-акадэмікі Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь: Віталій Сцяпанавіч Антанюк, Уладзіслаў Піліпавіч Карлоўскі, Ігар Станіслававіч Нагорскі, Сяргей Іванавіч Назараў, Уладзімір Паўлавіч Самсонаў, Вілор Фрыдманавіч Самерсаў, Міхаіл Максімавіч Севярнёў, Сцяпан Гардзеевіч Скарапанаў, Мікалай Іванавіч Смяян.

Члены-карэспандэнты Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь: Мікалай Мікалаевіч Андросік, Рыгор Іванавіч Афанасік, Іосіф Міхайлавіч Багдзевіч, Леанід Сцяпанавіч Герасімовіч, Станіслаў Іванавіч Грыб, Уладзімір Рыгоравіч Іванюк, Іван Мацвеевіч Карпуць, Мікалай Андрэевіч Кавалёў, Аляксандр Вікенцьевіч Караткевіч, Фёдар Уладзіміравіч Мірачыцкі, Пётр Іванавіч Ніканчык, Сямён Георгіевіч Шарэцкі, Вячаслаў Аляксандравіч Шаршуноў, Уладзімір Іосіфавіч Шляхтуноў, Уладзімір Аляксеевіч Шчарбакоў, Іван Паўлавіч Шыйко.

На Агульным сходзе ААН Беларусі 2 чэрвеня адбыліся выбары віцэпрэзідэнта, акадэмікаў-сакратароў галіновых аддзяленняў і членаў Прэзідыума ААН Беларусі. Віцэ-прэзідэнтам Акадэміі аграрных навук абраны акадэмік Міхаіл Максімавіч Севярнёў, акадэмікам-сакратаром Аддзялення земляробства і раслінаводства — акадэмік Вілор Фрыдма-

навіч Самерсаў, акадэмікам-сакратаром Аддзялення жывёлагадоўлі і ветэрынарыі — член-карэспандэнт Мікалай Андрэевіч Кавалёў, акадэмікам-сакратаром Аддзялення механізацыі, энергетыкі і эканомікі — акадэмік Ігар Станіслававіч Нагорскі; членамі Прэзідыума акадэміі абраны акадэмік Сцяпан Гардзеевіч Скарапанаў і член-карэспандэнт Фёдар Уладзіміравіч Мірачыцкі.